Ф 06-006

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

**Установа адукацыі**
**«Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»**
**(ГрДУ імя Я. Купалы)**

РАСПАРАДЖЭННЕ

Министерство образования Республики Беларусь

**Учреждение образования**
**«Гродненский государственный университет имени Янки Купалы»**
**(ГрГУ им. Я. Купалы)**

РАСПОРЯЖЕНИЕ

02.04.2021 № 94

г. Гродна

г. Гродно

Аб правядзенні конкурсу эсэ
“Нябесная заступніца Беларусі”

З мэтаю папулярызацыі нацыянальнай культуры, развіцця духоўнага, інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу студэнцкай моладзі і на аснове плана працы навуковай бібліятэкі на 2021 год

**ЛІЧУ НЕАБХОДНЫМ:**

1. Навуковай бібліятэцы (М.У. Грынько) арганізаваць і правесці ў перыяд з 12.04.2021 па 25.05.2021 конкурс эсэ “Нябесная заступніца Беларусі” (да Дня памяці прэпадобнай Ефрасінні Полацкай).
2. Зацвердзіць Палажэнне аб конкурсе “Нябесная заступніца Беларусі” (прыкладаецца).
3. Зацвердзіць склад арганізацыйнага камітэта конкурсу (прыкладаецца).
4. Зацвердзіць склад журы конкурсу (прыкладаецца).
5. Бухгалтэрыі правесці фінансаванне згодна сметы расходаў (прыкладаецца).
6. Дэканам (начальніку) факультэтаў, дырэктарам каледжаў забяспечыць удзел студэнтаў (курсантаў), магістрантаў, навучэнцаў у конкурсе.

Прарэктар па навуковай працы Ю.Я. Раманоўскі

ГД, з. 1030, т. 200 экз.

Ф 30.6-004

ЗАЦВЕРДЖАНА
распараджэнне прарэктара па
навуковай працы
ад «06» красавіка 2021 № 94

# ПАЛАЖЭННЕ

# АБ КОНКУРСЕ ЭСЭ "НЯБЕСНАЯ ЗАСТУПНІЦА БЕЛАРУСІ" (ДА ДНЯ ПАМЯЦІ ПРЭПАДОБНАЙ ЕФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ)

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Дадзенае палажэнне вызначае парадак і ўмовы правядзення конкурсу эсэ "Нябесная заступніца Беларусі" ва ўстанове адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы" (далей – Універсітэт) у межах плана працы навуковай бібліятэкі на 2021 год.

1.2. Заснавальнікам і арганізатарам Конкурсу з'яўляецца навуковая бібліятэка Універсітэта.

1.3. Непасрэдную арганізацыю і правядзенне Конкурсу ажыццяўляе аргкамітэт.

## 2. МЭТА І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ

2.1. Асноўная мэта Конкурсу – папулярызацыя нацыянальнай культуры, развіццё духоўнага, інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу студэнцкай моладзі.

2.2. Навучанне студэнтаў рацыянальным і эфектыўным тэхналогіям падрыхтоўкі і стварэння эсэ.

2.3. Фарміраванне ў моладзі спецыяльных навыкаў да напісання творчых прац.

2.4. Выхаванне духоўных каштоўнасцей, любові і павагі да культурнай спадчыны народа.

## 3. УДЗЕЛЬНІКІ КОНКУРСУ

3.1. Удзельнікамі Конкурсу з’яўляюцца студэнты, курсанты, магістранты ўніверсітэта, навучэнцы каледжаў.

## 4. УМОВЫ І ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

4.1. Конкурс праводзіцца на базе Ўніверсітэта ў межах плана працы навуковай бібліятэкі на 2021 год.

4.2. Конкурс праводзіцца ў перыяд з 12.04.2021 г. па 25.05.2021 г.

4.3. У перыяд з 12.04.2021 па 15.04.2021 г. размяшчаецца інфармацыя аб правядзенні конкурсу, аб умовах удзелу ў Конкурсе.

4.4. Да 15.05.2021 г. аргкамітэт прымае матэрыялы ўдзельнікаў конкурсу.

4.5. Да 24.05.2021 г. журы ацэньвае дасланыя на імя аргкамітэта працы.

4.6. 25.05.2021 г. падводзяцца вынікі Конкурсу, узнагароджваюцца пераможцы.

4.7. Крытэрыямі ацэнкі дасланых прац з’яўляюцца:

4.7.1. раскрыццё зместу і тэмы,

4.7.2. навукова-канкрэтная аснова,

4.7.3. падкрэсленая суб’ектыўнасць выказвання,

4.7.4. арыентаванасць на жывую гутарковую мову,

4.7.5. права на дадумванне, вымысел,

4.7.6. адметнасці кампазіцыі,

4.7.7. камунікатыўнасць, адрасаванасць іншаму чытачу,

4.7.8. праблемнасць,

4.7.9. арыентацыя на тэму,

4.7.10. вобразнасць (прыгажосць фраз, крылатыя выразы, параўнанні, эпітэты, лексічнае багацце, адзінства стылю),

4.7.11. граматнасць (адсутнасць арфаграфічных, граматычных, пунктуацыйных, маўленчых памылак).

4.8. Асновай да ўдзелу ў Конкурсе з’яўляецца заяўка, у якой указваюцца: прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка, факультэт, спецыяльнасць, курс, група, тэлефон, электронная пошта. Да заяўкі прыкладаецца тэкст эсэ. Усе матэрыялы неабходна прадставіць у папяровым і электронным выглядзе.

4.9. Заяўкі і матэрыялы да ўдзелу ў конкурсе дасылаюцца ў аргкамітэт да 15.05.2021 г. па адрасе: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, каб 116а. Тэл. (80152) 731924; 744378, e-mail: library@grsu.by

## 5. АРГКАМІТЭТ І ЖУРЫ КОНКУРСУ

5.1. Галоўным кіруючым органам з'яўляецца аргкамітэт, які зацвярджаецца распараджэннем прарэктара па навуковай працы.

5.2. Аргкамітэт забяспечвае арганізацыйна-прававое і інфармацыйна-метадычнае забеспячэнне Конкурсу, арганізуе яго правядзенне, рыхтуе неабходныя метадычныя матэрыялы і дакументы, вызначае крытэрыі ацэнкі конкурсных прац, ажыццяўляе кантроль за ходам конкурсу, устанаўлівае парадак і праводзіць рэгістрацыю атрыманых прац.

5.3. Журы конкурсу зацвярджаецца распараджэннем прарэктара па навуковай працы. Да працы ў складзе журы запрашаюцца спецыялісты ў галіне філалогіі, гісторыі, камунікацыі, выхаваўчай працы.

5.4. Журы ажыццяўляе ацэнку выканання конкурсных прац па крытэрыях, вызначаных аргкамітэтам.

5.5. У выпадку ўзнікнення спрэчных пытанняў выключнае права прымаць рашэнне мае аргкамітэт.

5.6. Праца аргкамітэта і журы ажыццяўляецца на грамадскіх пачатках.

## 6. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ І ЎЗНАГАРОДЖАННЕ

6.1. Пераможцаў Конкурсу вызначае журы.

6.2. Ацэнкі ўдзельнікаў Конкурсу заносяцца кожным членам журы ў спецыяльны бланк і перадаюцца падліковай камісіі.

6.3. Пераможцы Конкурсу вызначаюцца па суме набраных балаў. У выпадку роўнай колькасці балаў пераможцу вызначае старшыня журы.

6.4. Па выніках Конкурсу вызначаюцца пераможцы (1, 2, 3 месца).

6.5. Па рашэнні журы і аргкамітэта могуць вызначацца дадатковыя намінацыі.

6.6. Пераможцы і прызёры Конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі і памятнымі падарункамі заснавальнікаў Конкурсу.

6.7. Інфармацыя аб ходзе правядзення Конкурсу і яго пераможцах асвятляецца ў друкаваных і электронных сродках масавай інфармацыі.

Дырэктар навуковай бібліятэкі М.У. Грынько

ЗАЦВЕРДЖАНА
распараджэнне прарэктара па навуковай працы
ад «06» *красавіка* 2021 № 94

**Склад арганізацыйнага камітэта**
**па правядзенні конкурсу эсэ “Нябесная заступніца Беларусі”**

1. Грынько Мікалай Уладзіміравіч, дырэктар навуковай бібліятэкі – *старшыня арганізацыйнага камітэта*.
2. Місюкевіч Святлана Мечыславаўна, загадчык аддзела бібліятэчных інфармацыйных тэхналогій.
3. Флейта Ганна Аляксандраўна, бібліятэкар 1 катэгорыі аддзела бібліятэчных інфармацыйных тэхналогій – *сакратар аргкамітэта*.
4. Яўгенідзэ Ірына Тарыелаўна, бібліятэкар 1 катэгорыі аддзела бібліятэчных інфармацыйных тэхналогій.

Дырэктар навуковай бібліятэкі М.У. Грынько

ЗАЦВЕРДЖАНА
распараджэнне прарэктара па навуковай працы
ад «02» *красавіка* 2021 № 94

**Склад журы**
**па правядзенні конкурсу эсэ “Нябесная заступніца Беларусі”**

1. Марозава Святлана Валянцінаўна, доктар гістарычных навук прафесар, прафесар кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін – *старшыня журы.*
2. Грынько Святлана Дзмітрыеўна, старшы выкладчык кафедры прыродазнаўчых і філалагічных дысцыплін і методыкі іх выкладання.
3. Мінчук Іна Іванаўна, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры журналістыкі.
4. Тарасава Святлана Мікалаеўна, старшы выкладчык кафедры беларускай філалогіі.
5. Флейта Ганна Аляксандраўна, бібліятэкар 1 катэгорыі аддзела бібліятэчных інфармацыйных тэхналогій навуковай бібліятэкі, кіраўнік Клуба маладога літаратара.

Дырэктар навуковай бібліятэкі М.У. Грынько

Ф 14-001

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар Установы адукацыі
«Гродзенскі дзяржаўны універсітэт
імя Янкі Купалы»
_______________ М.І. Война
«_1_» красавіка 2021 г.

## СМЕТА РАСХОДАЎ

на арганізацыю і правядзенне конкурсу эсэ “Нябесная заступніца Беларусі”

| № п/п | Назва артыкулаў расходаў | Кол-ць, адз. вымяр. | Кошт, адз. вымяр. | Сума, рубл. | Крыніца фінансавання |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Рэкламна-сувенірная прадукцыя (камплект) | 30 | 6 | 180 | Па-забюджэтныя сродкі (прыбыль) |
| 2 | Кніга «От гимназии к университету: Библиографический указатель» | 30 | 17,10 | 513 | |
| **УСЯГО:** | | | | **693** | |

Галоўны бухгалтар В.С. Гацук

Начальнік планава-эканамічнага аддзела І.П. Бябко

Дырэктарбібліятэкі М.У. Грынько